Л. Вольскі А. Глобус С. Садоўская А. Хадановіч

# МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ

## ПАРЫЖСКАЯ ШКОЛА









ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

для дзяцей
і ўсіх на свеце

# МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ.

## ПАРЫЖСКАЯ ШКОЛА

Мінск
«Медысонт»
2018

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)
М32

**Аўтары:**
Л. Вольскі, А. Хадановіч (вершы)
А. Глобус (казкі, гульні і гістарычныя даведкі)
А. Глобус, С. Садоўская (гульні і гістарычныя даведкі)

М32 **Мастацтва** Беларусі XX стагоддзя.Парыжская школа : для дзяцей і ўсіх на свеце / Адам Глобус [і інш.]. — Мінск : Медысонт, 2018. — 112 с.

ISBN 978-985-7199-46-4.

Кніга «Мастацтва Беларусі XX стагоддзя. Парыжская школа» створана для сямейнага чытання. Тут вы знойдзеце вершы і гульні, кароткія біяграфіі і карціны вядомых мастакоў — ураджэнцаў Беларусі, якія сталі вядомымі ўжо на чужой зямлі, у сталіцы Францыі.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-7199-46-4**

© Калектыў аўтараў, 2018
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2018





Парыж. «Вулей»

# ПРАДМОВА

Парыжская школа — асобны феномен для беларускага мастацтва і нашай гісторыі. Станаўленне цэлага пакалення мастакоў, якія нарадзіліся ў Беларусі, адбылося ў Еўропе. Жыццё celebrating рознымі шляхамі прывяло кожнага з іх у Парыж. Амаль што ўсе яны жылі ў «Вуллі», доме-камуне для мастакоў,якія аднačасова стаў і галоўнай лабараторыяй мадэрнісцкага мастацтва пачатку XX стагоддзя. Усе гэтыя беларускія мастакі сталі прадстаўнікамі Парыжскай школы нароўні з Пабла Пікаса, Амедэа Мадзільяні, Фернанам Лежэ і іншымі сусветна вядомымі майстрамі.

Дзякуючы калекцыянерскай дзейнасці Белгазпрамбанка ў нашу краіну вяртаюцца шэдэўры мастакоў Парыжскай школы — ураджэнцаў Беларусі, творцаў, якія праславіліся за яе мяжой. А разам з карцінамі вяртаюцца і іх імёны, якія зноўку ўпісваюцца ў нашу гісторыю, у нашу памяць, у сучасны кантэкст. Але гэта не хуткі працэс.

Гэтая кніга — яшчэ адна магчымасць бліжэй пазнаёміцца з творчасцю нашых сусветна вядомых суайчыннікаў, тых, кім мы можам ганарыцца, каго мы павінны памятаць. А яшчэ, як і заўсёды, гэтая кніга створана для таго, каб дзеці і бацькі маглі цікава правесці час разам, даведацца нешта новае, пачытаць вершы ды казкі, памаляваць і пагуляць.

Перад вамі трохі хуліганскі падручнік гісторыі мастацтва.

**Гуляйце і ведайце сваіх мастакоў!**

# ШТО РАБІЦЬ З ГЭТАЙ КНІГАЙ?

Можна чытаць яе ад першай да апошняй старонкі.

І ад апошняй да першай.

Таксама ты знойдзеш у ёй вершы — іх можна чытаць і нават спяваць.

Адказваць на пытанні з кнігі і задаваць пытанні дарослым.

А яшчэ можна насіць гэтую кнігу на галаве, каб навучыцца хадзіць, як каралі і каралевы.

У гэтай кнізе абавязкова **ТРЭБА** маляваць!
Пачні зараз на суседняй старонцы.

Тут, здаецца, амаль нічога не напісана і нічога не намалявана.
Трэба гэта тэрмінова выправіць! Бяры каляровыя алоўкі
і малюй першае, што прыйдзе ў галаву.

Ого, ды гэтую кнігу ўзяўся чытаць сапраўдны мастак! Перагортвай старонку, там пачынаюцца гісторыі пра вядомых творцаў Парыжскай школы.

# Марк Шагал



**7.07.1887 — 28.03.1985**

Марк Шагал — самы вядомы мастак з Беларусі. Яго карціны можна ўбачыць у музеях Масквы і Парыжа, Нью-Ёрка і Стакгольма.

З 1923 года Марк Шагал стаў жыць у Парыжы, але ён ніколі не забываў свой родны горад — Віцебск.

# Шэдэўр




М. Шагал. Зялёны пейзаж.1948 — 1950

**Як табе здаецца, якога колеру гэты свет? Чаму? А што гэта за горад?**

Вядома, гэта родны для Марка Шагала Віцебск, такі дзіўны, магічны, пранізаны зялёным святлом, нібы ўбачаны ў сне. «Усё, што я калі-небудзь зрабіў у мастацтве, — казаў майстар, — было народжана любоўю. І мая самая вялікая любоў — гэта Віцебск і неба над Віцебскам».

# ГУЛЬНЯ

**Часам кажуць:**
**нехта**
**глядзіць**
**на**
**свет**
**праз**




## Як ты думаеш, што гэта значыць?

Здаецца, што Марк Шагал глядзеў на Віцебск праз зялёныя акуляры. Паспрабуй і ты ўявіць, што пазіраеш на свой любімы горад праз, напрыклад, аранжавыя, жоўтыя ці сінія акуляры. З дапамогай каляровых алоўкаў паспрабуй паказаць, што ты мог бы пабачыць!

МАЛЮЙ ТУТ



М. Шагал. Гадзіннік на палымяным небе. 1948 — 1950

Адам Глобус

# Кошка і мышка

## Казка пра пеўніка, намаляванага Маркам Шагалам на шматколернай карціне «Гадзіннік на палымяным небе»

Казку пра кошку і мышку я пачуў ад сіняга пеўніка. Ён спяваў яе гадзінніку. Той удзячна памахваў маятнікам і слухаў вось такую казку...

Было тое даўно. Яшчэ тады, калі на ўсім белым свеце жыла толькі адна кошка. Клікалі тую адзінокую кошку Мышкай. Яна была шэрая, як сапраўдная мышка. У яе было шмат розных сяброў і сяброўак. Кошка сябравала з сабакам і пеўнікам, з каровай і канём, з баранам і казой, але самай вялікай сяброўкай кошкі была маленькая шэрая мышка, якую ўсе клікалі Кошкай.

Шэрая мышка і шэрая кошка так сябравалі і так любілі адна адну, што аднойчы вырашылі памяняцца імёнамі. Тады кошка і стала Кошкай, а мышка зрабілася Мышкай. Толькі баран і каза, конь і карова, пеўнік і сабака не адразу змаглі прывыкнуць да новых імёнаў кошкі і мышкі. Шмат хто па звычцы называў кошку Мышкай,

а мышку — Кошкай. Мышцы надакучыла такая блытаніна, і неяк яна прыйшла да кошкі, каб вярнуць сабе старое імя:

— Дарагая сяброўка, давай зноўку памяняемся імёнамі. Ты зноў станеш Мышкай, а я, твая найлепшая сяброўка мышка, зноў стану Кошкай.

— Дарагая сяброўка, мы толькі пачалі прызвычайвацца да новых імёнаў. Навакольныя толькі-толькі перасталі памыляцца з нашымі імёнамі, а ты зноў хочаш усё паламаць і канчаткова ўсіх заблытаць. Цяпер я кошка, якую ўсе будуць называць Кошкай. Ты — мышка, якую ўсе рана ці позна стануць называць Мышкай. Так будзе. Павер мне! Я не буду нічога вяртаць. Не стану нічога блытаць. Ведаеш, як кажуць? Рыбка плыве, назад не аддае! — так кошка адказала мышцы.

Мышка раззлавалася і ўкусіла кошку за хвост. Ды так моцна, што кошка пакрыўдзілася на мышку на ўсё астатняе жыццё. З таго дня, з той сваркі і пачалася варажнеча кошкі з мышкай. І такая, што ўсе кошкіны кацяняты і ўсе мышкіны мышаняты працягваюць яе. Усе кошкі, колькі іх ёсць на белым свеце, палююць на мышак, а ўсе мышы, дзе толькі могуць, робяць розную шкоду кошкам: абкрадаюць, прыносяць ім хваробы і не даюць жыць спакойна.

Людзі кажуць, што ў далёкай будучыні ўсе кошкі абавязкова паміраюцца з усімі мышкамі. Наступіць шчаслівы дзень — і жывёлы зноў памяняюцца імёнамі. З таго дня кожная кошка зноў будзе насіць імя Мышка, а кожная мышка зноў стане звацца Кошкай…

Сіні пеўнік ведае шмат казак. Ён расказвае іх не толькі гадзінніку, які ўдзячна памахвае маятнікам, але і дзяўчатам і хлопцам. Ён расказваў іх і знакамітаму мастаку Марку Шагалу, які вельмі любіў слухаць казачніка-пеўніка і намаляваў яго на сваёй карціне «Гадзіннік на палымяным небе».

Казку пра кошку і мышку сіні пеўнік пачуў ад прадзеда, якому яе расказаў ягоны прапрадзед, які жыў даўно-даўно, калі на свеце была толькі адна шэрая кошка, якую звалі Мышкай.





М. Шагал. Аўтапартрэт. 1973

# З біяграфіі

## Марк і Віцебск

Марк Захаравіч Шагал нарадзіўся ў горадзе Віцебску ў небагатай сям'і. У 1906 годзе ён вучыўся ў вядомага віцебскага мастака Юдаля Пэна, потым у Пецярбургу, у Парыжы. У 1917 годзе Шагал на некалькі гадоў зноў вярнуўся ў родны горад, каб адкрыць Віцебскае мастацкае вучылішча і выкладаць у ім. У 1923 годзе мастак назаўжды з'ехаў у Парыж. Але Віцебск Марк памятаў і любіў заўсёды.

«Дарагія мае, родныя мае зоркі, яны праводзілі мяне ў школу і чакалі на вуліцы, пакуль я пайду назад. Прабачце мне, мае бедныя. Я пакінуў вас адных на такой страшнай вышыні!..

Мой сумны і вясёлы горад! Малым дзіцем глядзеў я на цябе з нашага парога. І ты ўвесь адкрываўся мне...

Платы, каламутная рэчка, спатоленыя малітвы — усё перад вачыма. Словы не патрэбныя.

Усё ўва мне: то прытаіцца, то заварушыцца, то ўзаўецца, як памяць пра вас», — пісаў мастак у сваім дзённіку «Маё жыццё».

# ГУЛЬНЯ

**Што адбываецца на гэтай карціне?
Што ў ёй незвычайнага?**

Праца Шагала трохі нагадвае дзіцячы малюнак. Але гэта не таму, што мастак не ўмеў маляваць, а таму, што ён, як дзеці, любіў ствараць чароўныя светы і прыдумляць дзіўныя гісторыі.

**Якая гісторыя схавана ў гэтай карціне? Што было да намаляванага моманту, а што здарылася пасля? Калі гісторыю намаляваць, то атрымаецца комікс.**

На наступнай старонцы мы пакінулі пустыя акенцы для твайго апавядання ў малюнках, у якім карціна Шагала павінна стаць яго часткай. Прыдумай свой варыянт і намалюй яго! Не забывай упісваць думкі ці фразы герояў у воблачкі.



М. Шагал. Лунацік. 1911 — 1912

МАЛЮЙ ТУТ



МАЛЮЙ ТУТ



М. Шагал. Акрабатка на кані. 1959




М. Шагал. Закаханыя. 1981

# Верш

## Шагал

Шагала ведаюць у свеце
Усе — дарослыя і дзеці.

Паехаў з Віцебска ў Парыж ён
І там дабраўся да вяршыняў.

Вісяць ягоныя карціны
І ў Нью-Ёрку, і ў Афінах.

Ад Барселоны да Шанхая
Ўсе ў захапленні ад Шагала.

Але заўжды ты мусіш помніць:
Шагал — ён віцебскі, наш, хлопец.

Лявон Вольскі

# Хаім Суцін



13.01.1893 — 9.08.1943

Хаім Суцін — адзін з самых вядомых прадстаўнікоў Парыжскай школы. Да 2012 года ў Беларусі не было ніводнай яго карціны.

У лютым 2012-га Белгазпрамбанк купіў карціну «Вялікія лугі ў Шартры, каля віядука» на аўкцыёне Крысціс, а ў 2013 годзе на аўкцыёне Сотбіс — карціну «Ева». Цяпер апошняя прызнана самым дарагім палатном у Беларусі, абедзве названыя карціны ўключаны ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

# Шэдэўр



Х. Суцін. Вялікія лугі ў Шартры, каля віядука. Каля 1934

Што намалявана на карціне? Як ты думаеш, у якой краіне ўбачыў гэты пейзаж Суцін? Які настрой у пейзажа?

Гэтую карціну Суцін напісаў ў 1934 годзе, калі гасцяваў у сваіх сяброў у маёнтку Леў блізу Шартра, у Францыі. Прырода, якая атачала мастака, і яго ўласны настрой сталі адзіным цэлым у гэтай карціне.

# ГУЛЬНЯ

Хаім Суцін маляваў не проста рэальнасць, а тое, як гэтая рэальнасць адлюстроўвае яго ўласны стан.

## Паспрабуй і ты намаляваць пейзаж-настрой!

На суседняй старонцы мы пакінулі людзей з карцін Суціна, а ты намалюй прыроду і свет вакол іх так, каб было зразумела, які ў цябе настрой сёння.

падкрэслі патрэбнае

## Настрой аўтара

Зводка надвор'я на маёй карціне сёння:

сонечна

хмарна



воблачна

дождж

ветрана

град



SOS
штармавое папярэджанне



туман

снег

**МАЛЮЙ ТУТ**

# З біяграфіі

## Хаім і яго жыцці

Хаім Суцін (на іўрыце ***Хаім*** значыць «жыцці», не адно, а шмат) родам з мястэчка Смілавічы, якое знаходзіцца за 40 кіламетраў ад горада Мінска. Ён нарадзіўся ў беднай сям'і і быў дзясятым з адзінаццаці дзяцей. Бацька будучага мастака, Саламон Суцін, працаваў краўцом і жаданне сына стаць мастаком не падтрымліваў, лічыў, што хлопец таксама павінен быў стаць краўцом або шаўцом.

Ужо ў школе Хаім стаў цікавіцца маляваннем. Аднойчы, па легендзе, ён нават скраў з дома дзве патэльні і прамяняў іх у старызніка на алоўкі, за што быў строга пакараны. Але гэты эпізод не адбіў у хлопчыка жадання маляваць.

У 1907 годзе Суцін з'ехаў у Мінск, паступіў у вучні да фатографа, працаваў рэтушорам, наведваў заняткі ў школе мастака Якава Кругера, потым вучыўся ў віленскай мастацкай школе. А ў 1913 годзе Хаім Суцін пераехаў у Францыю і пасяліўся ў доме-камуне для мастакоў «Вулей» (пра гэта дзіўнае месца ты можаш даведацца больш на старонцы **106**). Не маючы магчымасцей зарабляць сваім мастацтвам, Хаім працаваў грузчыкам, рознарабочым, чарцёжнікам, натуршчыкам, дэкаратарам.

Вядомасць і дастатак да мастака прыйшлі толькі ў 1923 годзе, калі амерыканскі калекцыянер Альберт Кумс Барнс набыў больш за 50 карцін Хаіма Суціна.



Хаім Суцін і Палет Журдэн з сабачкам. 1927



Х. Суцін. Ева. 1928

Адам Глобус

# Ева і ружа

## Казка пра партрэт, напісаны Хаімам Суціным

У маленечкай вёсцы Варакомшчына, як і ў мястэчках Дварэц, Дзятлава ды Наваельня, зрэшты, як ва ўсім нашым Навагрудскім краі ды і ва ўсёй нашай роднай Беларусі, называць дзяўчынку Евай лічылася небяспечнай справай. Старыя людзі казалі: імя Ева надае дзяўчыне, а пазней і жанчыне, чароўнай сілы. Ева ведае пра тое, пра што іншыя і не здагадваюцца. Ева можа зазіраць у далёкую будучыню, чытаць па левай далоні чалавека яго мінулае, а на правай далоні бачыць яго сутнасць і ўсе здольнасці і магчымасці.

Далёка не кожная дзяўчынка можа вытрымаць цяжар таемных ведаў, таму шмат хто з Евак цяжка хварэў, некаторыя з іх страчвалі памяць, а часам здаралася і найгоршае — яны паміралі ў маладым веку. Імя Ева цяжкае, на ім заўсёды ляжыць адказнасць за ўсе справы, якія рабіліся, робяцца і будуць рабіцца дзяўчынамі, названымі гэтым іменем. Таму бацькам трэба тройчы падумаць, перад тым як назваць даражэнькае дзіцятка Евай. Ну а калі ўжо назвалі, дык усёй сілай трэба такому дзіцяці дапамагаць і ахоўваць яго ўтрая больш, чым усіх іншых дзяцей. Можа, у іншых краінах імя Ева і не мае такой

чарадзейнай якасці. Не стану нічога даказваць. Кожны край мае свае звычкі, свае чароўныя таямніцы і дзівосы. У нас так, а ў іх інакш.

Мінская дзяўчынка Ева разам з бацькамі — з татам Сяргеем і мамай Верцяй — схадзіла на выставу карцін, што прыехалі ў Мінск з Парыжа. Доўгі час карціны жылі ў Францыі, а цяпер іх там купілі і перавезлі жыць у Мінск, бо мастакі, якія іх намалявалі, усе як адзін нарадзіліся ў нашай Беларусі. Ева ўважліва разглядала ўсе карціны, але адна ёй спадабалася найбольш. Гэта быў партрэт, намаляваны мастаком Хаімам Суціным. Яно і зразумела, бо на партрэце была жанчына, якая таксама насіла імя Ева. Дзяўчынка Ева мінская ў музеі пазнаёмілася з Евай парыжскай. Яны не толькі пазнаёміліся, але і пасябравалі. Ева малодшая папрасіла ў Евы старэйшай дапамогі.

Дзяўчынка доўга вышывала на сваёй белай сукенцы чырвоную ружу. Яна рабіла гэта надзвычай старанна, але ружа ніяк не вышывалася. Ніткі рваліся. Іголка калола пальцы маленькай Еве. Напарстак увесь час зляtaў з рукі і закочваўся чорт ведае куды. Маленькая Ева страшэнна змучылася з вышыўкай, таму і папрасіла ў Евы старэйшай дапамогі:

— Дарагая Ева, дапамажы мне з вышываннем чырвонай ружы! Я яе вышываю, а яна не вышываецца. То ў мяне нітка парвецца. То напарстак зляціць і пад шафу закоціцца. То іголка праколе палец да самай костачкі.

Расказала дзяўчынка Ева пра сваю злыбеду Еве, намаляванай Суціным. Падзялілася з ёю без усялякай

надзеі на дапамогу. Расказала, бо дзяўчынцы падалося, што трэба такое расказаць.

Намаляваная Ева выслухала просьбу і прашаптала:

— Дарагая сястра, я змагу табе дапамагчы з вышыўкай, калі ты мяне правільна папросіш. Каб я змагла дзейнічаць, трэба сказаць чароўнае слова «ажур». Але абавязкова тры разы запар: «Ажур-ажур-ажур». Трэба яго сказаць і паўтарыць сваё жаданне. Разумееш?

— Так! Разумею, — зашаптала дзяўчынка Ева. — Ажур-ажур-ажур, дарагая сястра Ева, дапамажы мне, калі ласачка, вышыць чырвоную ружу на святочнай сукенцы.

Можна не паверыць майму расказу і запытацца пра гэтую гісторыю ў бацькоў маленькай Евы, якія і самі моцна здзівіліся, пабачыўшы скончаную вышыўку сваёй дачушкі. Такой спраўна намаляванай і сакавіта вышытай ружы яны ніколі ў жыцці не бачылі. Уся школа хадзіла дзівіцца на белую сукенку з чырвонай ружай. Усе хвалілі дзяўчынку. Шмат хто спрабаваў дапытвацца пра сакрэт такога адметнага майстэрства, але маленькая Ева нікому нічога не расказвала, бо так наказала Ева партрэтная:

— Кожная дзяўчынка, дзяўчына і жанчына можа папрасіць у мяне дапамогі. Яна павінна сказаць чароўнае слова «ажур» і агучыць сваё запаветнае жаданне. Я выканаю нават самае складанае жаданне, але мая дапамога аднаразовая. Адной жанчыне я дапамагаю толькі адзін раз. І прашу не расказваць, якое менавіта жаданне я здзейсніла. Пра маю дапамогу можна распавядаць толькі самым любімым людзям. Разумееш?

— Разумею, дарагая Ева...

Калі ты мне не паверыш, дарагі чытач, скажаш, што ўсё гэта звычайная казка, тады сам схадзі ў музей і папрасі дапамогі ў намаляванай Суцiным Евы. Схадзі — і не пашкадуеш. Галоўнае, не забудзься сказаць ёй «ажур-ажур-ажур» і перадаць прывітанне ад казачніка Адама Глобуса.





Хаім Суцін і курыца

# ГУЛЬНЯ

Паглядзі яшчэ раз на карціну Суціна «Ева». Які настрой у намаляванай дзяўчыны?

**А што ты адчуваеш, калі глядзіш у яе вочы?
З дапамогай чаго ствараецца настрой
на партрэце?
Гэта не толькі выраз твару, але і пастава.
Якая яна ў Евы?
Якія колеры ты бачыш на карціне?**

Часам партрэт нам не вельмі шмат апавядае пра тое, чым чалавек займаецца, дзе жыве і якая ў яго сям'я, але расказвае пра яго настрой. Партрэт Евы менавіта такі. Мы не ведаем, хто яна і чым займаецца, але бачым настрой жанчыны.

**Паспрабуй і ты намаляваць партрэт блізкага табе чалавека так, каб адчуваўся яго настрой.**

МАЛЮЙ ТУТ



Х.Суцін. Жанчына, якая заснула з кнігай. Мадлен Кастэн. 1940

# Верш

# Суцін

Што мы чулі аб Хаіме Суціне?
Гладыёлусы ў чыстай пасудзіне.
Шмат разоў перапісваў палотны.
Маляваў селядцы галодны.

Ды, самім Мадзільяні сустрэты,
На ягоныя трапіў партрэты.
Непрызнаны сваёй айчынай,
Свет уражваў тушай бычынай.

Бо калісь нарадзіўся ў нас
І нашмат апярэдзіў свой час.
Кожны рух, кожны колер — адчайны,
Вечны выбух трывогі і тайны.

Паміж страхамі, болем і гневам,
Як Адам, шукаў сваю Еву...
За мяжой часам пішуць музеі,
Што з Літвы ён або з Расеі.

Ды вядома ўсім будзе хай ім:
З Беларусі наш слынны Хаім!
А яго геніяльная спадчына
Ёсць і ў нас, і таму — не страчана!

Андрэй Хадановіч

# Восіп Любіч



**6.12.1896 — 27.11.1990**

Жывапісец, графік, кніжны ілюстратар, скульптар. Цэнтральнае месца ў мастацтве Восіпа Любіча занялі сюжэтныя творы на тэатральныя і цыркавыя тэмы.

# Шэдэўр



В. Любіча. Танцорка з бубнам. Каля 1945

# ГУЛЬНЯ

Паглядзі на аўтапартрэт Восіпа Любіча. Што мастак хацеў расказаць гледачу пра сябе? Хто ён? Які ў яго настрой? Што натхняе Любіча ў працы?



В. Любіч. Аўтапартрэт з мадэллю. 1945

? Што такое аўтапартрэт?
Гэта калі мастак малюе сам сябе.





Тут мы пакінулі дзве пустыя рамы для тваіх уласных аўтапартрэтаў. Паспрабуй намаляваць сябе ў розны час дня і ў рознай абстаноўцы. Аўтапартрэт заўсёды расказвае свету пра цябе, а што апавядаюць твае малюнкі? Які ў цябе настрой? Чым ты захапляешся?

**МАЛЮЙ ТУТ**



В. Любіч. Сена ў Парыжы. Каля 1945

Адам Глобус

# Караблік

## Казка пра караблік, намаляваны мастаком Восіпам Любічам

Хлопчыка звалі Восіп. Простае імя. Нічога надзвычайнага ў ім не было. Восіп хадзіў у самую звычайную школу, сядзеў там за звычайнай партай і глядзеў у звычайнае акно, за якім ішоў самы звычайны дождж. Вучыўся Восіп не вельмі добра, але і не вельмі кепска, ён вучыўся так, як вучацца ўсе звычайныя дзеці.

Імя ў хлопчыка Восіпа было зусім звычайнае, але прозвішча ў яго было адметнае, запамінальнае — Любіч.

Аднойчы Восіп Любіч глядзеў на звычайны дождж за школьным акном. Дождж яму надакучыў. Восіп пачаў разглядаць падручнік і пабачыў на яго старонках маленькі караблік. Гэта быў любімы малюнак хлопчыка Любіча. Ён любіў караблікі і ўяўляў, як плавае на тым намаляваным карабліку па розных рэчках, морах і акіянах. Як караблік заходзіць у порты. Як там Восіп знаёміцца з рознымі людзьмі, якія расказваюць яму гісторыі пра цікавае жыццё. Шмат усяго рознага ўяўлялася Восіпу Любічу пра любімы караблік.

Гэта ўсё лёгка можна ўявіць і зразумець, а ёсць у гэтай гісторыі такое, што зразумець цяжка, але ў гэта можна паверыць...

Можна паверыць, што намаляваны ў кніжцы караблік раптам сказаў Восіпу Любічу:

— Восіп, дастань з кнігі старонку, на якой намаляваны твой любімы караблік.

— Дарагі мой караблік, я не магу даставаць з кнігі старонку, на якой ты намаляваны, бо я сапсую кнігу!

— Дарагі Восіп, гэтая старонка ў кнізе зроблена так, каб яе абавязкова дасталі і склалі з яе папяровы караблік.

Восіп Любіч акуратна дастаў з кнігі старонку і склаў з яе маленечкі папяровы караблік.

За акном скончыўся дождж, а ў школе, дзе вучыўся Восіп Любіч, скончыліся заняткі. Хлопец выйшаў са школы, падышоў да вясновага ручая і пусціў папяровы караблік у плаванне. Той паплыў, а хлопчык пайшоў следам. Ручаіна шырылася і шырылася, а караблік усё павялічваўся і павялічваўся. Калі ручаіна ўпала ў рэчку і занесла туды караблік, той стаў ужо вялікім караблём.

Восіп Любіч падумаў спачатку, што карабель зараз паплыве ў далёкае мора і забудзецца на хлопчыка, які яго зрабіў. Восіп быў нават упэўнены, што карабель сплыве і на гэтым чароўная гісторыя скончыцца. Але гісторыя не скончылася. Карабель раптам зменшыўся і прыплыў пад самы бераг. Восіп узяў свой караблік у рукі, старанна выцер яго хустачкай і схаваў у партфель.

Увечары хлопчык і караблік доўга шапталіся: яны распрацоўвалі маршрут вялікай вандроўкі. Караблік паабяцаў правезці Восіпа па розных рэках, морах і акіянах і завезці яго ў вялікі горад Парыж.

Цэлы год Восіп Любіч рыхтаваўся да вялікай вандроўкі, ён збіраў грошы і назапашваў прадукты. Праз год у апошні дзень вясны Восіп Любіч выправіўся на сваім караблі ў далёкае плаванне. Ён плыў з аднаго горада ў другі, пераплываў з адной краіны ў другую. Хлопчык плыў пад вялікімі зорамі, пад месяцам і пад сонцам. Плыў доўга-доўга і прыплыў у горад Парыж.

У Парыжы Восіп Любіч паступіў у школу малявання і стаў вучыцца на мастака. Яго карабель уладкаваўся працаваць на рэчцы Сене, па якой ён перавозіў розныя грузы, каб зарабляць на жыццё сабе і свайму найлепшаму сябру.

Восіп хутка вывучыўся на мастака і стаў пісаць сапраўдныя карціны алейнымі фарбамі на льняных палотнах. Усё гэта адбылося толькі дзякуючы караблiку. Удзячны мастак напісаў на палатне партрэт свайго любімага карабліка, які цяпер плыве і плыве ў вечнасць па рэчцы Сене праз горад Парыж.





В. Любіч. Мужчына, які выгульвае сабаку

# Любіч і тэатр

У пачатку 1920-х гадоў Восіп Любіч пасяліўся ў Парыжы. Святочная, зіхатлівая мішура свету кабарэ і цыркаў заўседы вабіла мастака. Любіч быў зачараваны цыркам і яго загадкавым «цыркавым людам»: акрабаты, эквілібрысткі, асілкі, наезнікі, клоўны. Дачка мастака, Дзіна Любіч, пазней будзе ўспамінаць: «Цырк быў любімым татавым месцам. Ён часта вадзіў мяне туды... Асабліва мы любілі маленькія вандроўныя трупы, якія выступалі ў дварах, на вуліцах».

А ты любіш цырк? Звычайна мы бачым толькі выступленні, а жыццё цырка да і пасля спектакляў нам не бачнае і невядомае. Менавіта гэтыя закулісныя гісторыі цікавілі Любіча больш за ўсё.

# З біяграфіі

Восіп Любіч нарадзіўся ў горадзе Гродна ў небагатай сям'і. Бацька мастака, Майсей Любіч, быў кавалём, але імкненне сына займацца мастацтвам — маляваннем і музыкай — падтрымліваў.

У 1915 годзе малады мастак адправіўся ў Адэсу, дзе паступіў у Мастацкае вучылішча Таварыства прыгожых мастацтваў, а ў 1920 годзе пераехаў у Берлін, дзе працаваў мастаком-дэкаратарам у тэатры-кабарэ «Сіняя птушка». Любіч таксама ствараў дэкарацыі для Берлінскай оперы, Берлінскага драматычнага тэатра, кінафільмаў. У 1923 годзе Восіп Любіч атрымаў заказ на афармленне парыжскага кабарэ і пераехаў у Францыю, дзе застаўся да канца жыцця. Пасяліўшыся на Манпарнасе, мастак хутка стаў часткай мясцовай мастацкай супольнасці.

# ГУЛЬНЯ

Кажуць, мастакі думаюць лініямі. Калі яны задумваюць карціны, або проста падарожнічаюць, або прагульваюцца, яны не фатаграфуюць свет, а робяць замалёўкі і эскізы. Так мастакі назіраюць за светам і запамінаюць яго, прыдумляюць свае карціны.

**Паглядзі на гэтыя накіды Любіча. Яны зроблены вельмі хутка.**



В. Любіч. Аголеная дзяўчына



В. Любіч. Двое мужчын

На наступных дзвюх старонках мы пакінулі табе месца для суперхуткіх накідаў. Намалюй за 30 секунд від з твайго акна; чалавека, які праходзіць міма цябе; маму, якая сядзіць побач.

**МАЛЮЙ ТУТ**

**МАЛЮЙ ТУТ**

# Любіч

Восіп Любіч быў не кволы.
Ён мастак Парыжскай школы.

Ён намаляваў нямала,
Бо жыццё яго натхняла.

Розных маляваў людзей ён,
І прадметы, і падзеі...

Нацюрморты і партрэты
Ты пабачыш і палюбіш.

Ён не кволы, Восіп гэты,
Ён магутны, Восіп Любіч.

Лявон Вольскі



В. Любіч. Кветкі. Каля 1940

# Восіп Цадкін



**28.01.1888 — 25.11.1967**

Восіп Цадкін — выдатны скульптар XX стагоддзя, у працах якога спалучаюцца прынцыпы кубізму і формы, характэрныя для першабытнага мастацтва.

# Шэдэўр



В. Цадкін. Возера. 1925.

**Цадкін напісаў гэты пейзаж пад уражаннем ад кубізму — напрамку ў мастацтве, які імкнуўся раскласці трохмерны свет на самыя простыя геаметрычныя формы.**

На гэтай гуашы «Возера» мы бачым добра вядомыя формы навакольнага свету: горад, возера, лодкі, баржы, паравоз з трубой, якая дыміцца. Але формы гэтых аб'ектаў спрошчаныя, яны зводзяцца да простых геаметрычных аб'ёмаў.



В. Цадкін. Носьбіт дароў (Пасланнік / Навігатар). 1937

Адам Глобус

# Памагаты

## Казка пра скульптуру, створаную майстрам Восіпам Цадкіным

Чалавек нараджаецца, расце, дужэе, а потым паціхупатроху пачынае старэць. Сілы пакідаюць спрацаванае цела. Старому чалавеку цяжка працаваць, цяжка жыць, і яму патрабуецца дапамога. Добрыя людзі заўжды дапамагаюць старому чалавеку. Такі ў людзей абавязак — дапамагаць таму, хто нарадзіўся, і таму, хто моцна пастарэў і занядужаў.

Стары Ян пражыў доўгае і цяжкае жыццё. Ён шмат папрацаваў на розных будоўлях, многа дамоў стаяць пад надзейнымі дахамі, якія зрабіў і давёў да ладу будаўнік Ян. За працай ён і не заўважыў, як праляцела жыццё. Сваю старасць Ян сустрэў адзін. Яму самому даводзілася прыбіраць кватэру, гатаваць абеды, насіць бялізну ў пральню. З кожным днём у старога Яна заставалася ўсё меней і меней сіл для жыцця. Каб схадзіць па хлеб, яму даводзілася траціць ледзь не ўсе сілы, якія былі адпушчаны прыродаю на цэлы дзень.

У хлебнай краме прадаўшчыцы і пакупнікі добра ведалі старога Яна. Яму спачувалі і дапамагалі, бо паважалі.

У гэтай жа краме часта купляў хлеб і знакаміты скульптар Восіп Цадкін. Ён пашкадаваў старога будаўніка і вырашыў яму дапамагчы па-сапраўднаму. Цадкін спачатку зляпіў з гліны, а потым і адліў з бронзы Памагатага для нямоглага Яна.

Вялікі бронзавы Памагаты пачаў рабіць для старога чалавека ўсю патрэбную работу. Ён прыбіраў кватэру, хадзіў па лекі ў аптэку, вазіў старога да розных дактароў, сам мыў бялізну, праў Янаву вопратку і старанна яе прасаваў, ён гатаваў для свайго гаспадара смачныя сняданкі, шыкоўныя абеды і лёгкія вячэры. Дзякучы скульптару Цадкіну, жыццё ў старога Яна стала цудоўным.

Але за светлымі днямі ў жыцці могуць прыйсці і цёмныя. Такі цёмны надышоў для Яна, калі Памагаты пайшоў па яблыкі. Дактары сказалі, што старому вельмі карысна штодня з'ядаць адзін зялёны яблык. У іх шмат жалеза, гэтым яблыкі і карысныя для старога арганізма.

Памагаты схадзіў у краму «Садавіна і гародніна» і купіў тамака цэлую скрыню карысных зялёных яблыкаў. Памагаты акуратна ішоў па тратуары, калі з дарогі проста на яго выскачыла машына і збіла.

За імгненне да гэтага шафёр той машыны пачаў аб'язджаць хлопчыка, які немаведама як апынуўся на дарозе. Шафёр не хацеў збіваць дзіця, таму і выскачыў на тратуар. За два імгненні да гэтага хлопчык, які ішоў па другім баку вуліцы, убачыў вялікага бронзавага чалавека са скрыняй яблыкаў. Хлопчыку так захацелася зблізу паглядзець на металічнага веліканa, што ён безразважна выбег на дарогу…

Удар машыны быў такі моцны, што Памагаты развалiўся на тры кавалкі. Скрыня з яблыкамі бразнулася на тратуар. Яблыкі раскаціліся па ўсёй вуліцы — бяры і частуйся.

Разламанага на тры часткі Памагатага людзі завезлі ў майстэрню да Восіпа Цадкіна. Той адкінуў усе справы і тры дні і тры ночы рамантаваў сваю скульптуру. Рамантаваў, рамантаваў, рамантаваў — і адрамантаваў!

Памагаты вярнуўся да старога Яна і яшчэ шмат-шмат гадоў рабіў за старога ўсю патрэбную работу...

Мы з табою ўжо ведаем, што чалавек нараджаецца, расце, дужэе, а потым паціху-патроху пачынае старэць. Ён старэе, а потым ціха сыходзіць ад нас.

Калі стары Ян сышоў ад нас, Памагаты вярнуўся да скульптара Цадкіна. Той перайменаваў яго, зрабіў Дараносцам. І цяпер велікан працуе нерухомай і вельмі каштоўнай скульптурай у музеі.



# З біяграфіі

Восіп Цадкін нарадзіўся, як і Марк Шагал, у горадзе Віцебску. Бацька мастака, Арон Цадкін, магчыма, быў выкладчыкам старажытных моў у Смаленскай семінарыі, мама, Сафія Лестэр, паходзіла з сям'і шатландскіх караблебудаўнікоў.

У 1900 — 1904 гадах Восіп Цадкін вучыўся ў Першым віцебскім гарадскім чатырохкласным вучылішчы. Першыя два гады — у адным класе з Маркам Шагалам, аднак у той момант будучыя мастакі яшчэ не сталі сябрамі. Там жа Цадкін вучыўся сталярна-такарнаму рамяству і браў урокі малявання ў Юдаля Пэна.

У 1905 годзе Восіп быў адпраўлены бацькамі ў Англію, у горад Сандэрлэнд. Праз год ён самавольна з'ехаў у Лондан і паступіў на працу ў сталярную майстэрню. Знакавай падзеяй у жыцці Цадкіна стала наведванне Брытанскага музея, пасля чаго ён канчаткова вызначыўся ў сваім жаданні стаць мастаком. Восенню 1909 года Цадкін пераехаў з Лондана ў Парыж, каб працягнуць навучанне. Там ён паступіў у Нацыянальную вышэйшую школу прыгожых мастацтваў. Але Цадкін жадаў займацца авангардным мастацтвам, найлепшай школай для яго стаў знакаміты «Вулей», у якім мастак зняў кватэру-студыю ў 1910 годзе.

Галоўным у творчасці Восіпа Цадкіна стала скульптура, якая вабіла мастака з дзяцінства. «Аднойчы, калі я быў яшчэ хлопчыкам, я знайшоў выдатную белую гліну.

Калі я стаў мяць яе рукамі, то адчуў ні з чым не параўнальную асалоду, якую адчуваю дагэтуль», — пісаў майстар у сваіх успамінах.



В. Цадкін. Трое аголеных за сталом. 1928

# ГУЛЬНЯ



В. Цадкін. Полукс. 1953 — 1955

**Паглядзі на гэтую скульптуру.**
**Як ты можаш апісаць яе формы?**
**Які настрой у героя скульптуры?**

**СМЕЛАСЦЬ**

**АДЗІНОТА** **ДЗЁРЗКАСЦЬ**

**РАДАСЦЬ**

**СУМ**

У аснове гэтага твора — антычная легенда пра братоў-блізнятаў Дыяскураў — Кастара і Полукса. Кастар нарадзіўся ад смяротнага чалавека Ціндарэя, а Полукс быў сынам бога Зеўса. Як і яго чароўны бацька, Полукс быў бессмяротным. Калі браты ўзмужнелі, яны ўславілі свае імёны перамогамі ў шматлікіх бітвах. Яны ўдзельнічалі ў паляванні на жудаснага вепрука і ў паходзе арганаўтаў у Калхіду, заняўшы ганаровае месца ў шэрагу найвялікшых герояў Грэцыі. Пасля гібелі смяротнага Кастара Полукс стаў маліць Зеўса, каб той даў памерці і яму разам з братам. І тады бог прапанаваў Полуксу выбар: альбо вечна знаходзіцца сярод багоў на Алімпе без брата, альбо разам з Кастарам жыць адзін дзень на Алімпе, а другі — у змрочным падземным царстве Аіда. Полукс з радасцю абраў апошняе. Вобразы братоў Дыяскураў сталі ўвасабленнем ідэалу дружбы і братэрскай любові.

**Формы, з якіх складаецца скульптура, перадаюць стан героя. Паспрабуй і ты зрабіць з пластыліну абстрактныя фігуры, якія перадавалі б розныя станы.**



В. Цадкін. Амерыканскі пейзаж. 1944

# Цадкін

Мастакі ў Парыж выпраўляліся,
Бо там добра ім малявалася.
Вось і Восіп Цадкін з Віцебска
Ў сталіцу Францыі выбраўся.

Мастаком ён зрабіўся вядомым,
А яшчэ больш вядомым скульптарам.
І стаяць скульптуры ягоныя —
Ці то весела ім, ці то сумна ім?

Ці смуткуюць яны, ці хвалююцца?..
А яшчэ не пазбегнуць згадкі нам:
Сярод мноства парыжскіх вуліцаў
Ёсць вуліца Восіпа Цадкіна.

Лявон Вольскі

# Сэм Царфін

(сапраўднае імя — Файбіш-Шрага Царфін)



**7.01.1900 — 25.09.1975**

Мастак Парыжскай школы, знакаміты сваімі містычнымі мігатлівымі пейзажамі, чароўнымі відамі на архітэктурныя помнікі сярэднявечча і прыроду Францыі.

# Шэдэўр



С. Царфін. Мон-Сэн-Мішэль. Каля 1950

**Якія пачуцці ўзнікаюць у цябе, калі ты глядзіш на гэтую працу Царфіна? Тут нібы ёсць нейкая таямніца!**

Гэтая карціна адносіцца да цыклу жывапісных твораў, прысвечаных выдатным помнікам сярэднявечнай архітэктуры Францыі. Мон-Сэн-Мішэль — гэта невялікі скалісты востраў на ўзбярэжжы Францыі ў праліве Ла-Манш.

Здаецца, што колеры на карціне таксама ствараюць магічную атмасферу: **сіне-зялёны, ліловы, блакітны.**




С. Царфін. Букет з белых кветак. Каля 1950

Адам Глобус

# Белыя кветкі

## Казка пра нацюрморт, напісаны мастаком Сэмам Царфіным

У майстэрню да мастака Сэма Царфіна завітала Люба Дук. Завітала не проста так. У жанчыны быў план, быў намер заказаць у Сэма Царфіна карціну. Яна хацела, каб мастак напісаў для яе букет белых кветак у шкляной вазе. Люба прынесла ў майстэрню і белыя кветкі, і шкляную вазу, і нават зялёны абрус, на якім, па яе задуме, мусіла стаяць ваза з кветкамі.

Сэм Царфін прапанаваў Любе Дук выбраць карціну з тых, што ўжо стаялі ў майстэрні. Іх было шмат, яны былі самыя розныя. Можна нават сказаць, што ў майстэрні былі карціны на любы густ. Але жанчына не пагадзілася:

— Мне трэба нацюрморт з белымі кветкамі, якія я вам прынесла. Яны павінны стаяць у шкляной вазе, а ваза мусіць стаяць на зялёным абрусе...

— Добра, я напішу такую карціну. Я буду пісаць яе доўга і старанна. Яна будзе каштаваць удвая даражэй за мае звычайныя карціны, гэта па-першае; а па-другое,

я хачу ведаць, чаму вам патрэбна менавіта карціна з гэтымі белымі кветкамі.

І тады Люба Дук расказала мастаку Сэму Царфіну цудоўную гісторыю пра букет белых кветак...

Аднойчы пасля цяжкага працоўнага дня Люба Дук вярнулася дамоў. На палавічку пад яе дзвярыма ляжаў цудоўны букет белых кветак. Жанчына ўзяла яго і занесла ў кватэру. Там яна набрала ў шкляную вазу вады, паставіла на стол, апусціла ў ваду букет. Кватэра, дзякуючы кветкам, набыла святочны выгляд. У Любы з'явіўся добры настрой. Яна села ў крэсла, стала любавацца букетам, стала гадаць і думаць... Хто мог ёй падараваць такія цудоўныя кветкі? Колькі Люба ні гадала, колькі ні думала, але так і не змагла прыдумаць, хто мог падараваць ёй белыя кветкі.

Цэлы тыдзень Люба Дук расказвала ўсім сваім знаёмым пра цудоўны букет. Знаёмыя, як і жанчына, спрабавалі гадаць і думаць, хто мог пакінуць пад дзвярыма белыя кветкі, але так і не змаглі нічога прыдумаць.

Праз тыдзень Люба знайшла пад дзвярыма новы букет свежых белых кветак. Яна трымала яго на стале, а потым паставіла на лядоўню. Упрыгожаная кветкамі, яна выглядала цудоўна. Люба Дук нават сказала ўслых:

— Лядоўня, з кветкамі ты выглядаеш цудоўна!

— Прыемна такое пачуць, — раптам адказала старая лядоўня сваёй гаспадыні.

— Лядоўня, можа, ты ведаеш... Хто нам дорыць белыя кветкі?

— Не ведаю, але я магу прасачыць, калі нехта прынясе і пакладзе пад нашы дзверы яшчэ адзін букет.

— Дарагая лядоўня, калі ласка, прасачы і раскажы пра чалавека, які прыносіць кветкі…

Дзень і ноч лядоўня прыслухоўвалася да крокаў за дзвярыма. Кожны раз, калі крокі набліжаліся да самых дзвярэй, лядоўня пазірала ў дзвярное вочка. І вось у адзін будзённы вечар яна ўбачыла, як нейкая жанчына кладзе кветкі пад дзверы. Калі незнаёмка ўзняла галаву, лядоўня пабачыла яе твар і пазнала найлепшую сяброўку Любы Дук — Ліду Лазар.

Лядоўня расказала Любе пра Ліду. Пра тое, як сяброўка крадком зайшла ў пад'езд і ціхенька, каб ніхто не пачуў, паклала кветкі пад дзверы.

Люба тры дні думала, што добрага яна можа зрабіць для сваёй сяброўкі Ліды Лазар, як аддзячыць ёй. І прыдумала зрабіць святочную вячэру, на якую запрасіла Ліду. Жанчыны разам частаваліся рознымі смачнымі стравамі, а потым доўга моўчкі любаваліся букетам белых кветак.

А яшчэ Люба Дук вырашыла заказаць у мастака Сэма Царфіна карціну і падарыць яе сваёй найлепшай сяброўцы Лідзе Лазар на дзень нараджэння.



# З біяграфіі

Мастак, як і Хаім Суцін, нарадзіўся ў мястэчку Смілавічы. Яго бацька, уладальнік гарбарнай майстэрні, быў чалавекам адукаваным, таму прыняў жаданне сына займацца маляваннем.

Царфін вучыўся ў Віленскай мастацкай школе, потым у іерусалімскай школе мастацтваў і рамёстваў «Бецалель». У 1923 годзе ён прыехаў у Берлін, дзе вучыўся пад кіраўніцтвам Макса Лібермана, а ў 1924 годзе назаўжды пераехаў у Францыю. Царфін наведваў музеі і галерэі, увайшоў у кола папулярных у той час мастакоў, сябраваў з Хаімам Суціным.

У пасляваенны перыяд да мастака прыйшла вядомасць. У 1947 годзе Царфін пераехаў у маленькі горад Рані-су-Буа пад Парыжам, дзе застаўся жыць да канца сваіх дзён. Ён шмат падарожнічаў па Францыі, часта бываў у Нармандыі, ездзіў у Брэтань, Савой, дзе шмат працаваў, пісаў пейзажы і нацюрморты.



С. Царфін. Закат. Каля 1950



С. Царфін. Парк. Каля 1950

# ГУЛЬНЯ

Здаецца, нібы мастак надзеў акуляры, якія дазваляюць яму бачыць свет як чароўны вітраж.



С. Царфін. Пейзаж з трыма дрэвамі. Каля 1950

**А хочаш і ты прымерыць такія «акуляры»? Паглядзі ў акно або лепш схадзі з кнігай у найбліжэйшы парк і паспрабуй заўважыць, а потым і замаляваць пейзаж з чароўнымі колерамі.**

Каб зразумець, як гэта атрымлівалася ў Царфіна, прыглядзіся больш уважліва да яго прац. Які колер выбірае мастак? Светлы або цёмны? Як ён іх спалучае? Якіх колераў больш, а якіх менш? Якія з іх больш яркія?

# Царфін

Сэм Царфін зваўся ў Смілавічах — Шрага.
Сусед быў Хаім Суцін, стуль і прага:
«Малы, жыві ў мастацтве, нібы ў казцы,
Малюй святло ў пажарнікаў на касцы!»

У Вільні, Палесціне і Берліне
На палатне тварыў і на тканіне.
Дабраўся да Парыжа, а чаму так?
Паводле чутак, добра плёў абутак.

Гуаш прыдумаў змешваць і алей,
Чым добры шлях праклаў сабе далей.
Прызваны быў алхімікам за творы:
Пейзажы, нацюрморты і саборы.

Нямала твораў знішчыла вайна,
Ды рос мастак, і слава, і цана.
А шмат ці мала? Хопіць для душы.
Бягуць дзве каляіны па «Шашы»...

Андрэй Хадановіч



С. Царфін. Шаша. Каля 1955

# Міхаіл Кікоін



**14.05.1892 — 4.11.1968**

Мастак, прадстаўнік Парыжскай школы, сябар Хаіма Суціна і Пінхуса Крэменя. Кікоін пісаў пейзажы, партрэты, нацюрморты, ню, быў стылістычным паслядоўнікам Суціна. Эфектна выкарыстоўваў колер і дамагаўся мастацкай выразнасці з дапамогай накладання яркіх фарбаў і гульні святлаценю.

# Шэдэўр



М. Кікоін. Букет. Каля 1920

**Паглядзі на гэты букет.**
**Што ў ім незвычайнага?**
**Што прыцягвае тваю ўвагу?**

Такі інтэнсіўны, поўны нюансаў колер выкарыстоўвае мастак і так шырока і густа кладзе фарбу, што здаецца, быццам самі прадметы змяняюць свае формы пад цяжарам фарбы і колеру.




М. Кікоін. Жанчына ў чырвоным

Адам Глобус

# Шэрая галубка

## Казка пра карціну мастака Міхаіла Кікоіна «Жанчына ў чырвоным»

Усе любяць адпачываць.

Цэлы год мы звычайна збіраемся ў адпачынак. Строім планы. Выбудоўваем маршруты. Выбіраем месца. Заказваем гатэль. Купляем білеты на самалёт. Пакуем чамаданы. Заводзім будзільнік, каб прачнуцца ў час і не праспаць вылет. Мы едзем на таксі ў аэрапорт і расказваем вадзіцелю пра свой выбар, пра сваё месца для адпачынку. Вадзіцель расказвае пра свае адпачынкі. Успамінае, як ён лавіў рыбу ў Нарвегіі, як цудоўна правёў час у Беларусі на Браслаўскіх азёрах...

У аэрапорце мы здаём багаж, ідзём на пасадку, сядаем у самалёт і ляцім. Мы ляцім над аблокамі, над гарамі, палямі і азёрамі, пралятаем розныя краіны і гарады, вялікія ды малыя. Палёт доўгі, але ён не стамляе, бо гэты палёт ужо ў адпачынку. Мы прылятаем у сонечную краіну. З аэрапорта едзем і селімся ў гатэль. А там...

Ва ўсіх бывае па-рознаму.

Гэтым разам я раскажу пра адпачынак Разалінды.

Жанчына пасялілася ў гатэлі на трэцім паверсе. У Разалінды быў выдатны нумар з балконам, які выходзіў на маленечкую вуліцу, што вяла на пляж. З балкона можна было любавацца морам. А яшчэ вялікай пальмай. Лісты яе павольна пахістваліся на марскім ветры. Усе лісты пальмы пахістваліся, акрамя аднаго. Ён бы нерухомы. Менавіта на яго прыляцела шэрая галубка. Яна прайшла па сярэдзіне ліста ў бок ствала і там села ў гняздо. Разалінда ўбачыла, як галубка села ў гняздо і знесла два яечкі.

З таго моманту кожную раніцу і кожны вечар Разалінда выходзіла на балкон і віталася з птушкай.

Дзесяць дзён шэрая галубка прасядзела ў гняздзе. На дзясяты дзень увечары птушка прыляцела на балкон да Разалінды і пракрычала:

— Больш не магу сядзець! Сіл больш няма. Я амаль нічога не ем і не п’ю. Зараз я палячу і разаб’ю свае яйкі...

Разалінда не ведала птушынай мовы і нічога не магла адказаць галубцы, якая паскардзілася на лёс. Але жанчына адчула, што трэба птушку падтрымаць, і сказала:

— Ты такая мужная і моцная, ты дзеля сваіх птушанятак дзесяць дзён прасядзела ў гняздзе! Патрывай яшчэ крышачку — і з тваіх яечак абавязкова вулупяцца птушаняткі.

Шэрая галубка не ведала чалавечай мовы, яна пераляцела з балкона на пальмавы ліст, прайшла да гнязда і прадзяўбла дзіркі ў яечках. На нейкае імгненне Разалінда падумала, што шэрая галубка страціла розум. Слёзы з’явіліся на вачах Разалінды. Праз слёзы яна і пабачыла,

як з прабітых яечак пачалі вылузвацца шэранькія маленечкія птушаняткі.

Узрадаваная Разалінда пайшла ў краму, накупіла розных смачных рэчаў. Яна набыла свежы хлеб і шмат садавіны, ліманад, а таксама крупы для шэрай галубкі. А яшчэ жанчына купіла чырвоную святочную сукенку.

Разалінда вырашыла адзначыць на балконе каля пальмы нараджэнне маленечкіх галубоў. Жанчына апранула чырвоную сукенку, наліла ў келіх ліманаду, ела садавіну і ўсхваляла шэрую галубку і яе птушанятак. Галубка нават крышачку падзяўбла крупы, якіх на спадачак насыпала ёй Разалінда.

Вярнуўшыся з адпачынку, Разалінда расказала гісторыю пра шэрую галубку мастаку Міхаілу Кікоіну. Ён папрасіў жанчыну апрануць святочную чырвоную сукенку і напісаў з яе патрэт.

Калі ты падыдзеш у музеі да таго партрэта блізка-блізка і прыслухаешся, дык можаш пачуць, як Разалінда расказвае гісторыю пра гняздо шэрай галубкі на пальме.



# З біяграфіі

Мастак Міхаіл Кікоін нарадзіўся ў сям'і банкаўскага служачага ў горадзе Гомелі. Калі Міхаіл быў маленькім, яго сям'я шмат пераязджала: яны нейкі час жылі ў горадзе Рэзекне, што ў Латвіі, а з 1904 года перасяліліся ў Мінск.

З 1905 года Міхаіл Кікоін вучыўся ў камерцыйным вучылішчы ў Мінску і паралельна наведваў заняткі ў прыватнай мастацкай школе Якава Кругера. Там ён пазнаёміўся і пасябраваў з Хаімам Суціным.

Для працягу мастацкай адукацыі ў 1909 годзе Міхаіл Кікоін пераехаў у Вільню і паступіў у Віленскую малявальную школу (разам з Хаімам Суціным). Там адбылося знаёмства Кікоіна і Суціна з Пінхусам Крэменем, якое перарасло ў шматгадовую дружбу. Пазней мастак успамінаў: «Мы выходзілі са школы, хлюпалі па гразі нашымі дзіравымі галёшамі, запырскваючы абыякавых прахожых, і палымяна спрачаліся пра мастацтва, жыццё і асабліва пра будучыню. Багатая фантазія заводзіла нас далёка. І неўзабаве Парыж заняў галоўнае месца ў нашых летуценнях».

У 1912 годзе мары спраўдзіліся і Міхаіл Кікоін пераехаў у Парыж, дзе пасяліўся ў «Вуллі».



М. Кікоін. Равін з сям'ёй. Каля 1950 — 1960

# ГУЛЬНЯ



М. Кікоін. Ваза з кветкамі. 1930

Які букет ты б паставіў сёння на стол?
Што яшчэ ляжыць на тваім стале?
Як гэтыя прадметы расказваюць пра чалавека, у доме якога можна пабачыць такі нацюрморт?

Мы пакінулі для цябе стол і вазу з карціны Міхаіла Кікоіна. З вазы дасталі кветкі (яны ўжо высахлі), са стала прыбралі рэчы.

**Дамалюй усё сам!**



МАЛЮЙ ТУТ



М. Кікоін. Пейзаж на беразе. Каля 1934

# Кікоін

Міхаіл Кікоін — майстар працавіты,
Каб не жывапіс, пайшоў бы — у паэты.
Паўжыцця любіў букеты й краявіды,
А пад старасць — краявіды і букеты.

Вывучаў авангардысцкія законы.
Разгружаў рэалістычныя вагоны.

Пераехаў у Парыж ды жыў у «Вулеі»,
Вылучаўся марынаркай і пенснэ,
Маляваў партрэты з файнаю дзявуляю,
На якіх яна чытае... або не.

У канцлагеры сядзеў — не звар'яцеў,
Не памёр, бо ўратаваўся неўспадзеў.

Бавіў старасць на Лазурным узбярэжжы,
Зведаў бедаў, але й радасці крыху,
Як і ўсе, каму па колькі лёс адрэжа,
Нібы «Постаці на звілістым шляху».

Андрэй Хадановіч

# Пінхус Крэмень



**28.07.1890 — 5.04.1981**

Мастак, графік, скульптар, прадстаўнік Парыжскай школы. Яго карціны — пейзажы, партрэты, нацюрморты і ню — найбольш блізкія да экспрэсіянізму — мастацкага стылю, які ў першую чаргу паказвае эмацыйны стан аўтара.

# Шэдэўр



П. Крэмень. Пейзаж у Серэ. Каля 1950

**Як табе здаецца, які настрой быў у мастака, калі ён маляваў гэтую карціну?**

Паглядзі на гэты пейзаж. Спачатку нават немагчыма зразумець, што ж там намалявана. І толькі калі прыглядацца пільна і доўга, можна заўважыць, як паступова — праз эмацыйныя мазкі, вуглаватыя формы, яркія колеры — пачынаюць выступаць сілуэты дрэў. Гэта праца таксама расказвае нам пра стан аўтара.



П. Крэмень. Клетка і рыба. Каля 1950

Адам Глобус

# Рыбы і птушкі

## Казка пра карціну мастака Пінхуса Крэменя «Клетка, птушкі і рыбы»

Дзед Адам моцна любіў унука Сяргея. Хлопчыка любілі і баба Эла, і мама Вольга, і тата Альгерд, але дзед любіў унука больш за ўсіх астатніх. Так яно выглядала, і так яно было на самай справе.

Кожную сераду дзед Адам вадзіў унука Сяргея ў краму «Прырода», дзе жыло і прадавалася featureнае чароўнае і неверагоднае. Там жылі рыбы і чарапахі, птушкі і пацукі, марскія свінкі і трусікі. Там палісквалі шкляныя акварыумы і блішчэлі металічнымі пруткамі featureнапамерныя клеткі. Там гучалі птушыны пошчак і булькатанне акварыумных бурбалак. Там дзеці і дарослыя выбіралі сабе сяброў і любімцаў.

Стары Адам і пяцігадовы Сяргей заўсёды доўга разглядалі рыбак. Яны выбіралі сярод іх самую прыгожую і чароўную. Калі яны знаходзілі сваю рыбку, прадаўшчыца сакам вылоўлівала яе з вялікага акварыума і пераносіла ў слоік.

Са слоікам у руках Сяргей вяртаўся дамоў. Ён нёс чырвоную рыбку ў свой хатні акварыум. Разам з дзедам унук выпускаў яе да гэткіх жа чырвоных рыбак з напаўпразрыстымі хвастамі. Дзед і ўнук любілі свой маленькі акварыум больш за ўсё на свеце. Любілі яго больш, чым тэлевізар і камп'ютар, больш, чым тэлефон і іншыя гаджэты.

Былі серады, калі дзед Адам і ўнук Сяргей куплялі ў краме «Прырода» толькі корм для рыбак. У такія дні яны разважалі, што да свайго акварыума, падобнага на шар, яны абавязкова, назбіраўшы рублёў, завядуць яшчэ адзін акварыум, падобны на куб. У тым шкляным кубе яны паселяць залатую рыбку, а потым — каб тая не сумавала ды не гаравала — прынясуць ёй сяброўку з крамы «Прырода».

У адну з чарговых серад дзед і ўнук кіраваліся ў краму. Раптам дзеду Адаму зрабілася кепска. Ды так, што сілы пакінулі яго старое цела. Дзед спыніўся, крыху пастаяў, а потым сеў проста на траву пад ліпай. Вочы ў старога заплюшчыліся. Ён цяжка ўздыхнуў і лёг на зямлю. Унук Сяргей стаяў каля дзеда, які ляжаў на траве, заплюшчыўшы вочы, і не ведаў, што трэба рабіць. Крычаць? Плакаць? Клікаць на дапамогу?

Ніхто не ведае, чым скончылася б гэтае драматычнае здарэнне, каб не жаўтакрылы верабей. Ён падляцеў да Сяргея, сеў яму на плячук і працырыкаў: «Бяжы, хлопец, дамоў! Скажы бабе Эле, маме Вользе і бацьку Альгерду, што твой дзед Адам ляжыць на траве. Скажы, што яго трэба ратаваць і выклікаць машыну з доктарам!»

Сяргей паслухаў жаўтакрылага вераб'я і пабег дамоў! Ён бег так хутка, як толькі мог. Хлопчык заляцеў у свой дом і пераказаў усё, што пачуў ад жаўтакрылага вераб'я.

Баба Эла выклікала хуткую. Мама Вольга і тата Альгерд дапамаглі доктару падняць дзеда Адама з травы і перанесці яго ў машыну. У бальніцы доктар сказаў, што дастаў дзеда Адама з таго свету. Сказаў: каб унук Сяргей адразу не прыбег і не паклікаў дарослых, стары быў бы ўжо мёртвым.

Доктар цэлы месяц пратрымаў дзеда Адама ў бальніцы. Яшчэ два месяцы стары праляжаў дома. Толькі праз тры месяцы дзед Адам і ўнук Сяргей зноў выбраліся ў краму «Прырода». Там яны купілі клетку з тым самым жаўтакрылым вераб'ём. Дзед і ўнук вырашылі, што будуць карміць і даглядаць не толькі рыбак, але і птушку, бо менавіта яна выратавала дзеда Адама ад смерці.

Цяпер на пачэсным месцы побач з круглым акварыумам стаіць прамавугольная клетка з жаўтакрылым вераб'ём і яго сяброўкай — жаўтакрылай вераб'іхаю. Кожную сераду ўнук Сяргей і дзед Адам купляюць у краме «Прырода» добры пачастунак для птушак і рыбак.





П. Крэмень. Паляўнічы. 1928.



П. Крэмень. Жанчына, якая сядзіць. Каля 1940

# З біяграфіі

Пінхус Крэмень нарадзіўся ў мястэчку Жалудок Лідскага павета Віленскай губерні (цяпер гарадскі пасёлак Жалудок у Гродзенскай вобласці) у шматдзетнай сям'і рамесніка.

Пачатковую мастацкую адукацыю Крэмень атрымаў у Віленскай мастацкай школе, падчас вучобы ў Вільні адбылося яго знаёмства з Хаімам Суціным і Міхаілам Кікоіным, якое перарасло ў шматгадовае сяброўства.

Крэмень марыў працягнуць сваю адукацыю ў Парыжы, таму ў 1912 годзе ён нелегальна перасёк мяжу і праз Германію перабраўся ў Францыю. Прыехаўшы ў Парыж, ён пасяліўся ў «Вуллі».

У 1919 годзе ў парыжскай галерэі Жака Павалоцкага адбылася першая персанальная выстава работ Пінхуса Крэменя, на якой былі паказаны міжземнаморскія пейзажы і серыя ню, напісаныя мастаком у 1918 годзе падчас знаходжання ў мястэчку Серэ на поўдні Францыі. На працягу ўсяго жыцця майстар часта бываў і падоўгу жыў у Серэ. Віды гэтага месца адлюстраваныя на многіх карцінах мастака розных гадоў.



П. Крэмень. Аўтапартрэт. Каля 1950

# ГУЛЬНЯ



П. Крэмень. Вялікі нацюрморт. 1950

**Паглядзі, тут мы змясцілі для цябе контуры аднаго нацюрморта (наш мастак, перш чым з’есці свой сняданак, намаляваў яго).**

Напоўні яго колерам так, як рабіў гэта Пінхус Крэмень. Вазьмі фарбы (лепш за ўсё гуаш) і ўяві, якія колеры з’явіліся б на гэтым нацюрморце, калі б святло падала з акна. Якія адценні можна было б заўважыць у, здавалася б, простых і зразумелых колерах?



МАЛЮЙ ТУТ



П. Крэмень. Жанчына, якая сядзіць. Каля 1950

# Верш

## Крэмень

Як скульптары пераходзяць
На жывапіс, ім не шкодзіць:
Такія пішуць карціны —
Карціць паглядзець са спіны!

Бо цяжка быць мастаком —
І не перайсці мяжы.
І наш перайшоў цішком.
(Памежніку не кажы.)

Мястэчка. Вільня. Парыж.
Шлях геніяў — там відней іх.
А потым дарога ўвыш,
Да дому свайго ў Пірэнеях.

І едуць на вернісаж
Сябры: нацюрморт, пейзаж,
Партрэт. (А зрэдку і конь.)
І кожная праца — агонь!

Бо высечы іскру ў цемені
Належыць Творцу — і Крэменю.

Андрэй Хадановіч

# ГУЛЬНЯ

## Хто жыве ў «Вуллі»?

Ты ўжо заўважыў, што амаль усе мастакі ў нейкі момант свайго жыцця ў Парыжы жылі ў «Вуллі» — знакамітым доме-камуне, створаным у 1902 годзе для маладых мастакоў мецэнатам і скульптарам-аматарам Альфрэдам Бушэ. Сам будынак быў набыты з распродажу маёмасці Сусветнай выставы 1900 года — гэта быў павільён бардоскіх вінаў, створаны па праекце Эйфеля. Дом перанеслі на яго цяперашняе месца і абсталявалі ў ім 140 атэлье-студый, якія Бушэ стаў здаваць за сімвалічную плату мастакам і літаратарам (месячная арэнда майстэрні каштавала, як два недарагія абеды). Сярод насельнікаў «Вулея» былі Лежэ, Мадзільяні, Шагал, Суцін, Цадкін, Крэмень і многія іншыя творцы. Сам Бушэ пабудаваў на тэрыторыі комплексу маленькі домік, які і займаў да сваёй смерці ў 1934 годзе. «Вулей» дагэтуль застаецца жылым комплексам і культурна-мастацкім цэнтрам.

**На гэтай старонцы мы намалявалі «Вулей» і Марка Шагала, які ляціць над ім. А ты намалюй астатніх мастакоў з нашай кнігі. Падумай, хто дзе будзе жыць і чым займацца на тваім малюнку.**






## МАЛЮЙ ТУТ

# ГУЛЬНЯ

## Твая выстава

Павесь
на сцены
свае карціны.

Напішы назву
выставы
і сваё імя.

Усе карціны, якія ты бачыў у гэтай кнізе, ты можаш знайсці ў мастацкай галерэі «Арт-Беларусь». А на гэтай старонцы мы пакінулі прастору галерэі пустой, каб ты мог зладзіць сваю выставу! Павесь на сцены свае карціны. Напішы назву выставы і сваё імя.

Вось і твая першая маленькая выстава!

Дзякуй, што чытаў і гуляў з намі! Абавязкова зайдзі з бацькамі ў галерэю «Арт-Беларусь», каб паглядзець арыгіналы работ, якія ты бачыў у кнізе (горад Мінск, Палац мастацтва, вул. Казлова, 3).

# ПАДЗЯКІ

Ў
галерэя
сучаснага мастацтва

Ў
дзіцячыя
творчыя
майстэрні

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

АРТ·БЕЛАРУСЬ

ЦЕНТР ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОГО И МЕДИА ИСКУССТВА
НКИ
НОВАЯ КУЛЬТУРНАЯ ИНИЦИАТИВА

ulej
Выдадзена
пры дапамозе
краудфандынга
Ulej.by

# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| Прадмова | 5 |
| Марк Шагал | 8 |
| Хаім Суцін | 24 |
| Восіп Любіч | 40 |
| Восіп Цадкін | 56 |
| Сэм Царфін | 68 |
| Міхаіл Кікоін | 80 |
| Пінхус Крэмень | 92 |

Літаратурна-мастацкае выданне

Вольскі Лявон
Глобус Адам
Хадановіч Андрэй
Садоўская Сафія

# Мастацтва Беларусі XX стагоддзя.
## Парыжская школа

для дзяцей і ўсіх на свеце

Рэдактар / В. Акудовіч
Менеджар і каардынатар праекта / І. Лукашэнка
PR-менеджар / В. Мжэльская
Мастацкі рэдактар / Bazinato
Карэктары / А. Нанас, Л. Наліўка

Падпісана да друку 19.11.2018. Фармат 60х84 1/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 6,5. Улік.-выд. арк. 3,8.
Наклад 1000 ас. Замова 8878.

0+

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
таварыства з абмежаванай адказнасцю «Медысонт».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/142 ад 09.01.2014.
№ 2/34 ад 23.12.2013.
Вул. Ціміразева, 9, 220004, Мінск.

## НАМАЛЮЙ ТУТ СВОЙ ШЭДЭЎР

**Табе спатрэбіцца: каляровыя маркеры**

ISBN 978-985-7199-46-4

9 789857 199464

МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ XX СТАГОДДЗЯ ПАРЫЖСКАЯ ШКОЛА